ПАМЯЦЬ

# КАЛІ СЛОВА ПАЭТЫЧНАЕ – НАБАТ

**9 ліпеня 2024 года на Ваўкавышчыне адбылася грамадска-літаратурная акцыя Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ «Пад мірным небам Беларусі». Акцыя прайшла ў фармаце тура грамадзянскай паэзіі і была прысвечана 80-годдзю вызвалення нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Паэты ўсклалі кветкі да абеліскаў і прадэкламавалі свае творы.**

На нашай зямлі ёсць месцы, дзе пануе цішыня, дзе простыя словы здаюцца лішнімі. І толькі слова паэта, што вырываецца з самых глыбіняў душы, гучыць як набат, нават калі прамаўляецца ціха.

Паэтычнае слова ў якасці даніны памяці тым, хто змагаўся супраць фашызма і стаў яго ахвярамі восем дзясяткаў гадоў таму, гучала на Ваўкавышчыне 9 ліпеня падчас акцыі «Пад мірным небам Беларусі». Яе здзейсніла дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб'яднання «Надзея». Паэты чыталі свае вершы каля помнікаў піянерам і камсамольцам-падпольшчыкам у вёсцы Карпаўцы і на месцы спаленай фашыстамі вёскі Шавулічы.

Аўдыторыяй літаратараў у Карпаўцах сталі выхаванцы летняга аздараўленчага лагера і педагогі СШ № 5 г. Ваўкавыска. Юных слухачоў

найбольш уразіў верш паэтэсы Святланы Глембоцкай «Яблоки под фуфайкой». Гэты твор яна прысвяціла подзвігу сваёй свякрухі Марыі Мікандраўны Міхеевай, у дзявоцтве Жыгачовай, дачкі камандзіра пагранічнай заставы, якая была сувязной партызанскага атрада. На возе ў кошыку для адцягвання ўвагі фашыстаў яна перавозіла звычайныя кіслыя яблыкі, а на сабе пад фуфайкай — «яблыкі» з выбуховых рэчывам.

Тамара Мазур патлумачыла ў сваім вершы сэнс памяці, увасобленай у помніках: «Помнікі ж, як вечныя салдаты, над магілай кожнай у страі». Людміла Кебіч і Людміла Шаўчэнка падзяліліся творамі, напісанымі паводле ўспамінаў сваіх бацькоў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Дзмітрый Радзівончык прачытаў не толькі свае вершы, але і Мікалая Іваноўскага, які жыве ў Ваўкавыскім раёне і нядаўна выдаў паэтычны зборнік «Адгалоскі саракавых».

Крануў і ўрывак з нарыса Станіслава Вішнеўскага «Тэрмінова патрэбна сувязь», які ён напісаў пра сваю родную цётку, педагога Вольгу Васільеўну Волах (Яфіменка). Падчас вайны яна была тэлефаністкай і ўдзельнічала ў вызваленні г. Ваўкавыска.

Мемарыяльны комплекс «Шавулічы» уразіў пісьменнікаў так моцна, што свае творы яны чыталі ледзь стрымліваючы слёзы. Месца відавочнага генацыду беларускага народа не можа не закрануць струны жывой душы, тым больш паэтычнай.

**Тамара МАЗУР**
член Саюза пісьменнікаў Беларусі



**На фота:** падчас грамадска-літаратурнай акцыі «Пад мірным небам Беларусі» на тэрыторыі вёсак Карпаўцы і Шавулічы (Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць). 9 ліпеня 2024 года.


В д. Карповцы в годы
Великой Отечественной войны
действовала подпольная
комсомольская организация.
Комсомольцы:
Василий Сорока,
Павел Василевский,
Сергей Васильчук,
Иван Василевский,
Владимир Кухта,
Владимир Северин,
Николай Северин,
взрывали военные объекты и
уничтожали немецко-
фашистских солдат.


В д. Карповцы в годы
Великой Отечественной войны
действовала подпольная
детская организация
"Пионерский тайник„.
Юные мстители:
Владимир Сергейко,
Леонид Седеневский,
Анатолий Веретило,
Иван Веретило,
Николай Зыбко,
Иван Северин,
Нина Хамко,
Михаил Василевский,
Владимир Белобоцкий,
Владимир Косило,
Николай Сорока,
Иван Радецкий,
Иван Кухта,
Иван Хомко,
Николай Зыбко
Мужественно боролись с
немецко-фашистскими захватчиками
за честь и независимость
нашей Родины.





**Вёска Карпаўцы. Помнік камсамольцам-падпольшчыкам. Выступае Людміла Кебіч**



**Людміла Шаўчэнка**



**Дзмітрый Радзівончык**





**Выступае Святлана Глембоцкая**





**Выступае публіцыст Станіслаў Вішнеўскі (гарлітаб’яднанне «Надзея»)**



**Аўтар рэпартажу з месцаў падзеі Тамара Мазур**





**Акцыя «Пад мірным небам Беларусі» падчас наведвання мемарыялу на месцы сястры Хатыні, спаленай вёскі Шавулічы. Ускладанне кветак.**








**Шавулічы. Помнік героям-партызанам і падпольшчыкам**



**Людміла Кебіч**



**Святлана Глембоцкая**







Тамара Мазур




Станіслаў Вішнеўскі




Людміла Шаўчэнка






Дзмітрый Радзівончык





**Людміла Антонаўна Кебіч з унучкай Мар’янай і сынам Іванам**



**Святлана Глембоцкая і Станіслаў Вішнеўскі**



**Дзмітрый Радзівончык і Людміла Кебіч**


ВЕЧНАЯ ПАМЯТЬ СЕМЬИ
ПАРОМСКИХ.
ЯН ЛЕТ - 54
АЛЕКСАНДРА - 49
ЯДВИГА - 20
ЛЕОНАРДА - 17
ВАНДА - 11
ЧЕСЛАВА - 7
ПОГИБЛИ.
7. 7. 1943 г.
ОТ ГЕЛЕНЫ ВИКТОРА.




**Месцы спаленых хат**


СЕРАБРОУСКІ А.Д.
40





**Акцыя СПБ-Гродна «Пад мірным небам Беларусі» ў Ваўкавыскім раёне. Гэта маляўнічае месца на Ваўкавышчыне ў народзе празвалі «беларускімі Мальдывамі». Экзатычна выглядаюць затопленыя крэйдавыя кар'еры.**